# З НОВЫМ ГОДАМ!


# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

24 СНЕЖНЯ 1996 года
аўторак
№19
(1755)


## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:


Фантанчык ва універсітэцкім дворыку — мара дырэктара дырэкцыі па будаўніцтву аб'ектаў універсітэта С.А.Сідарава

Адчуць сябе амерыканцам прапануе студэнтка журфака Марыя Грамыка і фірма "Мак Дональдс"

Стар. 2

Новы год у гісторыі і геаграфіі

Стар. 3

Адкажыце на навагоднюю анкету — і святочны настрой вам забяспечаны

Стар. 4


*Напярэдадні Новага года і Калядаў рэдакцыя "Беларускага універсітэта" віншуе студэнтаў і супрацоўнікаў з надыходзячымі святамі. Жадаем усім моцнага здароўя, студэнтам — выдатна здаць сесію, выкладчыкам — добрых студэнтаў, усім — цудоўна сустрэць Новы год і прыемна правесці святочныя дні.*

## Весткі з галоўнага корпуса

Навагодняя елка збярэ 27 снежня сваіх маленькіх сяброў — дзяцей выкладчыкаў і супрацоўнікаў нашага універсітэта — на самае лепшае з усіх святаў календара. Дзетак зноў чакае сустрэча з ласкавым і шчодрым Дзедам Марозам (ім будзе мастацкі кіраўнік народнага хору выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта "Родніца" В.Ч.Гаплічык) і Снягуркай (студэнткай 5-га курса ФЭФа Т.Шчурок), а таксама вясёлыя гульні, атракцыёны і прызы.

Навагодняе віншаванне падрыхтуюць акцёры Тэатра юнага гледача. Гэта будзе музычная казка "Навагоднія прыгоды Жоўціка і Разанчыка на Гарызонцкіх астравах", якая абавязкова спадабаецца не толькі дзецям, але і іхным бацькам.

Камісія садзеяння сям'і і школе пры прафкаме выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта ўжо рыхтуе 3 тысячы салодкіх падарункаў для дзяцей ва ўзросце да 14 год. Значную грашовую дапамогу ў гэтым аказаў рэктарат універсітэта.

Упрыгожваннем навагодняй залы займаецца дырэкцыя па справах культуры, прафкам студэнтаў, аддзел па выхаваўчай рабоце з моладдзю. А сама лясная прыгажуня-елка будзе вышынёй 3 метры. Пад самую столь...

*Кацярына ТКАЧЭНКА*






***6 снежня ў нашым універсітэце ў рамках праграмы "Моладзь супроць СНІДу" дырэкцыяй па справах культуры быў арганізаваны рок-фестываль.*** У праграме прынялі ўдзел групы "Hasta la Fillsta ", "Чорны пясок", "Барадаты грынвіч", "Рэнегат" і іншыя. Вялікую дапамогу аказалі ў правядзенні фестываля рэктарат, аддзел выхаваўчай работы з моладдзю, прафкам студэнтаў, камітэт Беларускага саюза моладзі.

Гітарыст групы "Hasta la Fillsta" Сяргей Кананові́ч зазначыў: "Я рады, што універсітэт правёў такую акцыю. Раней ніколі такога не было. Было цікава пачуць групы, якія прымалі ўдзел у гэтым рок-фестывалі. Канешне, узровень многіх з іх пакідаў жадаць лепшага, але некаторыя групы выдзяляліся сваім энтузіязмам. Хочацца думаць, што універсітэт і надалей будзе працягваць арганізаўваць такія акцыі, таму што яны аб'ядноўваюць моладзь".

## ДАІ паведамляе

Снежань. Снег схаваў пад сабой небяспечныя ўчасткі дарогі. Дый накатаныя месцы пагражаюць дарожнымі здарэннямі. Кароткі светлавы дзень яшчэ больш ускладняе дарожны рух. У гэты перыяд ДАІ на найбольш небяспечных участках дарог устанавіла дадатковыя знакі для абмежавання хуткасці руху.

Штомесячна расце колькасць дарожна-транспартных здарэнняў. За 11 месяцаў гэтага года ў Мінску адбылося 709 ДТЗ, у якіх загінулі 94, параненыя 724 чалавекі.

Пешаходы! Ад Вас патрабуецца пастаянная ўвага пры перасячэнні праезджай часткі.

Вадзіцелі! Пазбягайце рэзкага тармажэння. У зімовы час пазбягайце руху па дарозе "накатам".

Віншуем супрацоўнікаў і студэнтаў БДУ з надыходам Новага году! Зычым Вам здароўя, поспехаў ва ўсіх добрых справах! Пешаходам — спакойных пераходаў праезджай часткі, вадзіцелям — шчаслівай язды.

*А.КУДРАЎЦАЎ, дзяржаўтаінспектар ДАІ*

## Сакрэт фірмы

Адразу дзвюм падзеям была прысвечана вечарына, якую ладзілі студэнты і выкладчыкі філалагічнага факультэта БДУ ў адзін са снежаньскіх дзён: 75-годдзю універсітэта і 90-годдзю пачатку літаратурнай дзейнасці славутага аўтара "Новай зямлі" — Якуба Коласа.

Вечарына стала лагічным працягам шэрагу святаў, што адбыліся раней у жыцці Мінска. На гэты раз у госці да студэнтаў прыйшлі прадстаўнікі трох пакаленняў беларускіх пісьменнікаў: Сяргей Грахоўскі, Іван Шамякін, Леанід Дранько-Майсюк, супрацоўнікі Літаратурнага музея Я.Коласа. Вяла вечарыну выкладчыца факультэта, дацэнт Вольга Васільеўна Казлова. Студэнты — народ цікаўны, таму не абышлося без пытанняў да гасцей. У адказах на іх пісьменнікі распавялі аб сваёй сённяшняй працы, творчых планах, поглядах на сучасную літаратуру, становішчы беларускай мовы ў грамадстве.

Не абмінулі ўвагай вечарыну і традыйныя ўдзельнікі святаў, прысвечаных Я.Коласу: ансамбль народнай музыкі "Славяначкі", вакальны квартэт "Святлана" са Стоўбцаў. У іх артыстычным выкананні прагучалі прыгожыя песні на словы Я.Коласа, М.Багдановіча. Сваім выступленнем самадзейныя артысты ў каторы раз даказалі, што паэтычнае слова і музыка — два паняцці, якія не толькі могуць, але і павінны існаваць разам.

## Постфактум

# Варыяцыі на тэму "Давайце пафантазіруем"

"Інтэрнат № 6: шляхі развіцця" — праграма чарговага "круглага стала", які адбыўся 11 снежня па ініцыятыве студгарадка і студсавета вышэйзгаданага інтэрната. Не можа не радаваць той факт, што кіраўніцтва універсітэта сур'ёзна занялося вырашэннем студэнцкіх праблемаў. За апошнія тры месяцы гэта ўжо трэцяя сустрэча.

Канцэпцыю развіцця інтэрната № 6 распрацавалі самі студэнты. Праект прапануе размясціць на цокальным паверсе будынка пральню самаабслугоўвання для студэнтаў, саўну, гімнастычную і трэнажорную залу, цырульню, ксеракопію. Мяркуецца, што працаваць будуць самі студэнты па прынцыпу частковай занятасці. А заробленыя грошы пойдуць на добраўпарадкаванне інтэрната.

Абмяркоўвалася пытанне ўзмацнення прапускнога рэжыму на вахце. Сістэма "сустрэчнага пропуску" працуе дрэнна. А 90 % парушэнняў у інтэрнаце звязаныя з так званымі "гасцямі". У сувязі з гэтым студсавет прапануе ўзнавіць сетку радыёвяшчання, да якой падключыць сістэму тыпу "дамафон". Пульт кіравання "дамафонам" устанаўліваецца на вахце з мэтай выкліку жыхароў інтэрната пры неабходнасці. Вахту мяркуецца абсталяваць закрытага тыпу, устанавіць "вяртушку".

Пакуль студсавет марыць пра кавярню і пакой рукадзелля (з вязальнымі і швачнымі машынкамі), нагадаю, што ў інтэрнаце № 6 практычна няма душа, а стан сантэхнікі прызнаны катастрафічным.

Дэкан факультэта прыкладной матэматыкі П.А.Мандрык адзначыў, што эксперымент патрабуе вялікіх фінансавых затратаў. А гэта значыць, што студэнт павінен будзе несці матэрыяльную адказнасць за захаванасць маёмасці. Для гэтага распрацоўваецца дагавор на юрыдычным узроўні.

Прарэктар па вучэбнай рабоце і сацыяльных пытаннях А.В.Паўлаў ідэю студэнтаў ухваліў, дадаўшы, што інтэрнатам трэба самім вучыцца зарабляць грошы. А для таго, каб пачаць рэканструкцыю інтэрната, неабходна, каб праект быў ухвалены, складзены каштарыс выдаткаў — і за справу. Калі вопыт акажацца ўдалым, з часам можна будзе яго перанесці і на іншыя інтэрнаты.

*Віялета СІЛАКОВА, студэнтка 4-га курса факультэта журналістыкі*

*Як толькі змяніўся статус нашага універсітэта і ён ператварыўся ў вядучую вышэйшую навучальную ўстанову ў нацыянальнай сістэме адукацыі Беларусі, з'явілася надзея на падмацаванне такога прэстыжнага статусу матэрыяльна-тэхнічнай базай. А калі ў сувязі з 75-годдзем БДУ было выдзелена 14 мільярдаў рублёў на завяршэнне рэканструкцыі будынка фізічнага факультэта, усе са спадзяваннем пачалі назіраць за аднаўленнем працы будаўнікоў у дворыку універсітэцкага гарадка. З гэтай нагоды карэспандэнт "Беларускага універсітэта" сустрэўся з дырэктарам дырэкцыі па будаўніцтву аб'ектаў універсітэта Сяргеем Архіпавічам Сідаравым.*

# Таямніцы універсітэцкага двара





## Пра юбілей дырэкцыі

— 30 верасня 1997 года дырэкцыі па будаўніцтву аб'ектаў універсітэта споўніцца 10 гадоў. За гэты час быў пабудаваны інтэрнат па вуліцы Крапоткіна, спартыўны комплекс на Кастрычніцкай, жылыя дамы на вуліцах Лабанка і Варанянскага. У наступным годзе, акрамя рэканструкцыі будынка фізічнага факультэта, мы плануем завершыць будаўніцтва інжынерных сетак БДУ ў Шчомысліцы, біялагічнай станцыі на возеры Нарач, біялагічнага факультэта, інтэрната на 1000 месцаў. Планаў многа, будзем імкнуцца іх рэалізаваць.

## Пра будынак фізічнага факультэта

— Спадзяемся, што да новага навучальнага года праца будзе завершана. Наогул, гэта няпросты аб'ект, акрамя ўсяго ён мае гістарычную каштоўнасць, таму прыходзіцца працаваць вельмі рупліва. Плануецца, што ў адноўленым будынку размесціцца адміністрацыя універсітэта, яна цяпер знаходзіцца ў галоўным корпусе.

## Пра дарожкі і клумбы

— Канешне, адрэмантаваць новы будынак і не зрабіць новыя дарожкі мы не маглі. Калі яшчэ выпадзе такая магчымасць? Адну дарожку мы ўжо пракалі, будзе зроблена некалькі прыгожых клумбаў, паставім новыя лаўкі для адпачынку.

## Пра новую універсітэцкую агароджу

— Новая універсітэцкая агароджа будзе металічная, прыгожая, ажурная. На варотах добра было б зрабіць эмблему універсітэта. Канчатковага варыянту мы пакуль не маем, эскізы карэктуюцца, паляпшаюцца, узгадняюцца. Адразу хачу папярэдзіць, што ні выхаду, ні якіх "дзірак" на прывакзальную плошчу з боку Бабруйскай не будзе...

## Пра "МакДональдс"

— Плануецца, што паблізу універсітэцкага гарадка будзе пабудаваны вядомы рэстаран "Макдональдс". Так што ў студэнтаў будзе унікальная магчымасць хутка паабедаць падчас перапынку...

## Пра мару дырэктара

— Ёсць у мяне адна патаемная мара — фантанчык перад абноўленым будынкам фізічнага корпуса. Дрэнна, што пад нашым універсітэцкім дворыкам праходзіць метро: гэта абмяжоўвае нашыя архітэктурныя фантазіі.

*Таямніцамі цікавілася*
*Анастасія КУХАРСКАЯ*



# Адчуйце сябе амерыканцам

Няшмат знойдзецца мінчан, якім дата 10 снежня ну зусім нічога не гаворыць. Вы адзін з іх?! Успомніце, на чым спыняўся ваш позірк некалькі апошніх тыдняў у той час, калі вы ў метро разглядалі рэкламкі на сценках вагона? А вялізныя транспаранты ўпоперак галоўных вуліц і праспектаў нашай сталіцы, а рэкламныя стэнды з намаляваным на іх гіганцкім гамбургерам? Апошняя падказка ўжо зусім празрыстая. Правільна!!! У Мінску пачаў працаваць "МакДональдс". Адкрыццё трох рэстаранчыкаў, якія належаць гэтай сусветна знакамітай кампаніі, адбылося, калі ўжо быць зусім дакладным, у ноч з 9 на 10 снежня 1996 года. Такім чынам, Беларусь стала сотай краінай, чые жыхары могуць пачаставацца так званай fast food — "хуткай ежай" ва ўстанове, фірменным знакам якой з'яўляецца вялізная жоўтая літара М.

Крыху падзялюся ўражаннямі ад наведання аднаго з "МакДональдсаў" — таго, які адкрыўся на праспекце Скарыны (два другія працуюць каля плошчы Бангалор і ў мікрараёне "Паўднёвы Захад", на праспекце Дзяржынскага. А яшчэ некалькі рэстаранчыкаў, калі справы пойдуць добра, плануецца адкрыць на працягу надыходзячага года).

Калі параўнаць (была ў мяне такая магчымасць) мінскі "МакДональдс" з рэстаранчыкам гэтай жа фірмы ў Маскве ці нават у Заходняй Еўропе (дакладней — у Нарвегіі), трэба сказаць, што "МакДональдс" — з'ява сапраўды інтэрнацыянальная. Не мае значэння, дзе знаходзіцца "хуткакормячая" ўстанова, на якой мове гавораць наведвальнікі і прадаўцы і якімі грашовымі адзінкамі праводзіцца разлік, — усюды персанал апрануты ў аднолькавую уніформу, усюды ваш заказ пакладуць у аднолькавыя фірменныя пакецікі ці на паднос з макдональдсаўскай сімволікай, дый асартымент страваў, само сабой зразумела, адзін і той самы ва ўсіх краінах.

Што асабліва прыемна, дык гэта тое, што ветлівасць, такая характэрная для абслугоўваючага персаналу "МакДональдса", а таксама чысціня і парадак, якія пануюць у самім рэстаранчыку, таксама аказаліся "інтэрнацыянальнымі". Паслужлівы афіцыянт ці афіцыянтка (да вопраткі кожнага прышпілена бірачка з імем) аформіць ваш заказ, а хлопец ці дзяўчына ля касы паклапоціцца, каб выбраная вамі разнавіднасць гамбургера ці марожанага, папярэдне ўпакаваная па ўсіх правілах макдональдсаўскай завядзёнкі, хутчэй трапіла вам у рукі. Трэба сказаць, што ў першы дзень працы "МакДональдса" ў Мінску на падступах да рэстарана і ў ім самімназіралася, так бы мовіць, некаторае стоўпатварэнне. Каля ўваходу ў памяшканне з'явілася чарга, а ўнутры афіцыянты ледзь спраўляліся з натоўпам жадаючых пакаштаваць традыцыйнай амерыканскай кухні. Але іспыт быў вытрыманы з бляскам.

Што яшчэ? Ах так! Канешне, цэны. А яны тут, трэба заўважыць, больш сціплыя, чым можна было чакаць. Цэны прымальныя нават для сярэдняга студэнта, відома ж, пры ўмове, што ён не будзе наведвацца ў "МакДональдс" кожны дзень (а як хацелася б!) і заказваць усе запар гамбургеры і кактэйлі, якія ёсць у спісе.

Дык вось. Гамбургер каштуе 9 тысяч беларускіх рублёў, чызбургер — 10 тысяч, двайны гамбургер і чызбургер адпаведна 15 і 17 тысяч; бульба-фры — 8, 10 і 12 тысяч у залежнасці ад велічыні порцыі; можна заказаць комплексны абед з гамбургерам (25 тысяч) і г.д. Славуты біг-мак каштуе 21 тысячу. На дэсерт падаюць марожанае (сама каштавала!) — шакаладнае, клубнічнае і карамельнае (кошт 9 тысяч), столькі ж каштуе гарачы яблычны пірожак. Кока-кола, зноў жа ў залежнасці ад велічыні порцыі, абыдзецца вам у 8, 10 ці 12 тысяч. Кава каштуе 8 тысяч, гарачы шакалад — 8, кактэйлі — ад 9 да 14 тысяч.

Адно застаецца дадаць: "МакДональдс" — гэта месца, пакідаючы якое, вам не будзе пакутліва балюча за бязмэтна патрачаныя грошы.

*Марыя ГРАМЫКА,*
*студэнтка факультэта журналістыкі*



# Новы год...

## СТАРАЖЫТНЫ

Новы год — самае прыемнае свята з усіх прыдуманых чалавецтвам. Нібыта змовіўшыся, 31 снежня ўсе мы нягледзячы на адрозненні ў адукацыі, прафесіях і матэрыяльным становішчы адрываемся ад сваіх праблемаў і збіраемся разам, каб добра бавіць час. І забаўляемся як можам, упрыгожваем елку, накрываем стол, дорым адзін аднаму падарункі...

А ўся справа ў тым, што святкаванне Новага году — самы старажытны звычай, які дастаўся нам ад нашых продкаў. Сярод іншых традыцыяў святкаванне зімовага сонцавароту аказалася самым трывалам і захавалася да нашых дзён. Дарэчы будзе прыгадаць, што пачынаць узімку каляндарны год загадаў Юлій Цэзар, які ўвёў сонечны каляндар у 46 годзе да н.э.

Праз важнасць абраду, які заключаўся ў звароце да прыродных сілаў, старажытнымі народамі былі распрацаваныя акты магічнага заклінання розных стыхіяў. Водгулле гэтых рытуалаў мы бачым у сённяшніх навагодніх традыцыях. Людзі танцавалі вакол дрэва, каб задобрыць боства лесу. Хлапушкі і свечкі бяруць пачатак ад рытуальных вогнішчаў і паходняў.

А калі зазірнуць у самую глыбіню, дык нават звычай падарункаў можна звязаць з ахвяраваннямі. Хаця ёсць у падарункаў і больш позняе тлумачэнне: яны ідуць ад абрадаў культу "магіі першага дня". Усё, што адбываецца ў першы дзень года, уяўляе сабой падзеі будучыні. Дастатак страваў на стале — сімволіка будучай урадлівасці. Першы чалавек, які ўваходзіць зранку ў дом, таксама вельмі важны. У Францыі некалі гэта абавязкова мусіў быць мужчына з нязрослымі бровамі. А ў Англіі ўсім, хто прыходзіў, давалі па лыжцы аўсянкі. Адсюль ідзе і прымаўка "Пачатак — палова справы" з усімі варыяцыямі ў еўрапейскіх мовах.

А традыцыя ставіці елку ў кожным доме прыйшла да нас параўнаўча нядаўна — у XVIII стагоддзі, з берагоў Рэйна. Праўда, тады гэта яшчэ не было сямейнай традыцыяй, а агульнагарадской. Елку ставілі і ўпрыгожвалі на плошчы, а па заканчэнні свята дзецям і беднякам дазвалялася страсаць з дрэва плады і прысмакі. З берагоў Рэйна традыцыя распаўсюдзілася па ўсёй Еўропе, увайшла ў кожную сям'ю.



Наконт таго, чаму елка стала сімвалам Новага года, існуе мноства тэорыяў: нібы колкія іголкі абараняюць ад вядзьмарак і іншых злых духаў, нібы елка, упрыгожаная пернікамі і свечкамі, увасабляе райскае дрэва. Але самая праўдападобная — што елка як вечназялёная дрэва сімвалізуе адраджэнне і вечнасць, сілу і працяг жыцця.

*Надзя БАРАНАВА*

---

## КІТАЙСКІ

***У рэдакцыю "Беларускага універсітэта" прыйшлі кітайскія студэнты, якія выказалі жаданне на час практыкі супрацоўнічаць з нашай газетай. Спадзяемся, што нашым чытачам будзе цікава даведацца, як адзначаюць Новы год у Кітаі.***

Мы хочам расказаць вам пра кітайскі Новы год, які святкуецца 7 лютага.

Яшчэ 5 лютага кожная сям'я абавязана наклеіць на сценкі парныя надпісы, якія зычаць шчасця ў новым годзе. Увечары 6 лютага ўсе садзяцца за святочны стол, на якім галоўнай стравай з'яўляюцца пельмені, а потым запальваюць бенгальскія свечкі. У 8 гадзінаў вечара па тэлевізару пачынаецца трансляцыя святкавання Новага года. Гэты фестываль доўжыцца 5-6 гадзінаў, на працягу якіх практычна ніхто не спіць.

Апоўначы прыходзіць наш Новы год. Мы ўсе вельмі хвалюемся і радуемся гэтай падзеі. Старыя запальваюць фіміям, каб маліцца аб шчасці, дабрабыце, багацці.

Зранку 7 лютага прынята апранацца ў новае адзенне. Бацькі даюць дзецям грошы і падарунак на Новы год. Асноўнай стравай на святочным стале ізноў служаць пельмені, у адну з якіх кладзецца манетка. Лічыцца, што чалавек, якому трапіцца "сюрпрыз", будзе шчаслівым, здаровым і будзе мець шмат грошай.

Пасля адпачынку падаецца шыкоўны абед, які змяшчае шмат садавіны і стравы традыцыйнай кітайскай кухні з мяса, рыбы, дравеснага грыба, трэпанга, медузы, чарапахі і г.д.

На наступны дзень пачынаюцца адведзіны сваякоў, якія цягнуцца амаль месяц.

У новым годзе школьнікаў адпускаюць на канікулы на цэлы месяц. Рабочыя таксама маюць тыдзень адпачынку, але працуюць у гэты тыдзень пазменна.

Да навагодніх традыцыяў адносіцца і выстава лямпы, якая праводзіцца 21 лютага. На вуліцах, у парках, дома ўсе ставяць каляровыя лямпы. Увечары мы гуляем па вуліцы і любуемся лямпамі.

*Чжан Цзін,*
*Сюй Фань,*
*Шэнь Гун Фу,*
*Ван Лін,*
*Лі Янчжэн,*
*Чжан Хэ Фень,*
*студэнты І курса факультэта журналістыкі*

---

## СУЧАСНЫ

### Як накрыць святочны стол

Як сустрэнеш Новы год, так яго і правядзеш. Гэта значыць, што і на стале павінна быць усё самае смачнае і апрануцца трэба не па-будзённаму. Не ведаю, наколькі ў беднага студэнта хопіць мужнасці і сродкаў абнавіць напярэдадні навагодніх святаў свой гардэроб, але святочны стол павінен быць святочным.

Перш за ўсё трэба паклапаціцца аб шампанскім — без яго Новы год не Новы год. "Савецкае" шампанскае знікла з прылаўкаў магазінаў задоўга да надыходзячых святаў. А там, дзе яшчэ і прадавалі, давалі ў нагрузку да дзвюх бутэлек падарункавую каробку (коштам 10 тысяч), маўляў, завод зрабіў, трэба камусьці прадаць. Самое шампанскае палегчыць ваш кашалёк на 52 тысячы. Тым жа, каму не пашчасціла набыць "Савецкае" шампанскае, можна замяніць яго рознымі імпартнымі (гэта значна даражэй) ці набыць свечку ў выглядзе запаветнай бутэлечкі (яе кошт амаль супадае з коштам сапраўднага шампанскага — 38 тысяч рублёў). Цэны на іншыя спіртныя напоі прыкладна такія: гарэлка "Белая Русь" — 36.800, "Пшанічная" (0,7 л) — 45.300, гарэлка "Мінская" спецыяльная — 286.500, віно "Манастырская хата" — 97.500. Сапраўдныя знаўцы могуць пры жаданні і фінансавых магчымасцях пачаставацца больш вытанчанымі напоямі: віскі "Вялікая карона" — 1 мільён 90 тысяч, каньяк "Напалеон" — 2 мільёны 700 тысяч. А каб купіць французскі каньяк "L'OR DE MARTELL", які каштуе ... 27 мільёнаў 750 тысяч, патрабуецца каля ста студэнцкіх стыпендый ці каля трыццаці заробкаў выкладчыкаў.

Мясныя вырабы лепш купляць не з ялавічыны: наступны год Быка — не трэба гнявіць мірную жывёліну. Каўбаса вэнджаная "Раўбіцкая" каштуе 154 тысячы рублёў за кілаграм, сервелат "Барысаўскі" — 94 тысячы, калбаса "Экстра" — 62 тысячы. Студэнцкая сям'я можа задаволіцца больш таннымі варанымі каўбасамі. Іх кошт ад 30 да 50 тысяч. А вось куры (50 тысяч), качкі (52 тысячы), індычкі (44 тысячы) — задавальненне дарагое. Яйкі (за адзін дзесятак) — 15 тысяч.

У рыбным аддзеле (рыба вельмі ўпрыгожвае святочны стол, а таму набыць яе пажадана) расцэнкі такія: скумбрыя халоднага вэнджання — 78 тысяч, селядзец сярэдняга пасолу — 39, гарбуша — 65. Ікру, канешне, сабе дазволіць рэдкі студэнт. І ўсё ж. Ікра ласосевая (у бляшанцы 140 грамаў) каштуе 136 тысяч. Паколькі на бутэрброды яе трэба не вельмі многа, то можна купіць яе ўскладчыну ці ў рыбнай краме на вул. К.Маркса, дзе яна прадаецца расфасаваная па 20, 40 грамаў.

Цукеркі. Без іх таксама Новы год уявіць цяжка. Разам з "Савецкім" шампанскім зніклі за месяц з прылаўкаў магазінаў і цукеркі айчыннай фабрыкі "Камунарка". У кандытарскіх аддзелах універсамаў прадаюцца толькі шакаладныя цукеркі прыбалтыйскай і маскоўскай вытворчасці. Але і гэта лепей, чым нічога. "Ластаўка" — 80 тысяч, "Аронія" — 75, "Ананасныя" — 100, "Чырвоная шапачка" — 110. Канешне, можна было б абмежавацца карамеллю ("Дзюшэс", "Тэатральная", "Чарадзейка" па 19 тысяч за кілаграм), аднак Новы год, як і дзень нараджэння, — толькі раз на год. І трэба адсвяткаваць яго так, каб не было пакутліва балюча за праведзены час. Што датычыцца тортаў, то "Бісквітны з арэхамі" патрабуе затратаў у 35 тысяч, "Гамяльчанка" — 75, "Нёман" — 50.

Садавіна, нягледзячы на немалыя цэны, таксама павінна ўпрыгожваць святочны стол. А завершанасць і вытанчанасць яму нададуць свечкі (ад 10 да 40 тысяч).

Увогуле, так. Калі не купляць каньяк "L'OR DE MARTELL", то стыпендыі на аднаго чалавека за святочным сталом хопіць. Не забудзьцеся толькі на тое, што акрамя Новага года прынята адзначаць яшчэ і калядныя святы. Пастарайцеся разлічыць.

*Наташа САВЕЛЬЕВА*



# НАВАГОДНЯЯ АНКЕТА

**Ці хацелі б Вы стаць дэканам:**
а) хацеў бы;
б) не хацеў бы;
в) хацеў, дык ужо і быў.

**Вы чытаеце "Беларускі універсітэт":**
а) "ад коркі да коркі";
б) толькі самае цікавае;
в) толькі свае матэрыялы, бо нічога больш цікавага ўсё адно не друкуюць.

**На Новы год Вы:**
а) паедзеце дадому;
б) пойдзеце ў госці;
в) будзеце здаваць "хвасты".

**Рэдакцыя дае Вам магчымасць самастойна дапоўніць нашу анкету:**

______________________________

______________________________

______________________________

______________________________

______________________________

**Як Вы дабіраецеся на заняткі:**
а) пехам;
б) на грамадскім транспарце;
в) на сваім невялікім "Мерседэсе";
г) на сабаках.

**Што Вы лічыце падзеяй года:**
а) 75-годдзе універсітэта;
б) Дзень нараджэння рэктара;
в) замуравалі дзірку ў агароджы БДУ;
г) бацькі купілі новы пухавік.

**Прыгадайце Вашага любімага выкладчыка:**
а) прыгадаў;
б) не прыгадаў;
в) навошта?

**Ваш любімы час прыходу на заняткі:**
а) за 5 хвілінаў да пачатку;
б) праз 5 хвілінаў пасля пачатку;
в) праз 5 хвілінаў пасля заканчэння.

**Ваша любімая кніга:**
а) "Калабок";
б) ашчадная;
в) падручнік "Інтэграваная сістэма аўтаматызацыі праектавання і падрыхтоўкі вытворчасці пячатных плат на персанальнай ЭВМ тыпу IBM PC".

**Якім прысмакам Вы аддаеце перавагу:**
а) булка "Студэнцкая";
б) торт "Птушынае малако";
в) ананасы ў шампанскім;
г) піва з селядцом;
д) сала ў шакаладзе.

**Жаданне, якое Вы загадаеце ў навагоднюю ноч:**
а) здаць сесію;
б) здаць бутэлькі;
в) здаць суседзяў па пакоі, каб жыць аднаму;
г) займець дачу ў Фларыдзе;
д) здаць "адпрацоўку" ў інтэрнаце.

**Вам хапае стыпендыі:**
а) на 30 секунд (раздаць пазыкі);
б) на вечар (схадзіць у кавярню);
в) да наступнай стыпендыі (піць ваду і глядзець на хлеб суседа).

**Каго вы лічыце чалавекам года:**
а) сябе;
б) дэкана;
в) рэктара;
г) буфетчыцу;
д) сантэхніка Жору.



*Сергей ГОРЯЙНОВ*

# Криминал

## фельетон

***Еще, кажется, вчера я получил от знакомого замызганный сверток из 37 наискось исцарапанных и перепачканных чернилами листков с клятвой, что все написанное в них ПРАВДА, и превеликой просьбой отнести всё это в редакцию. После исправления орфографических ошибок и вычеркивания нецензурных выражений я получил два листочка печальной истории, которую и предложил для опубликования.***

Утром, когда снег еще только собирался свалиться пухлыми шапками на несчастные деревья, крыши и угрюмых дворников, я пришел в универ, наверное, в слишком хорошем настроении. О том, что этот день станет кошмаром не столько для меня, сколько для "братиков" (двух моих друзей), к 8.20 этого утра не знал ни я, ни они, пришедшие 12-ю минутами позже. Сдав свои модные, еще "с нуля", пилотки в гардероб милой и безмерно счастливой бабушке-одуванчику, ребята направили свои стопы к лифту и безжалостной науке. Отважно, не отступая ни на шаг, в течение двух пар грызли мы гранит этой самой науки.

Но к 12.45 приехал к нам в гости друг, и блудливая мысль о Пиве закралась в сердца, не позволив досидеть пару. 40 долгих минут билось наше благоразумие с бесчестной идеей, но наконец оно сдалось, и вся наша компания спустилась в гардероб за куртками. Там выяснилось, что к 13 часам бабушка-одуванчик очень сильно изменилась. В общем, новая была бабушка. Она и сообщила мгновенно ошалевшему "братику", что номерок его, равно как и право на собственную дубленку, фальшивый! В довершение всего обругав нас с ног до головы, бабушка почему-то обиделась и отправила "братика" к коменданту.

После того, как угрюмая процессия из коменданта (женщины крайне суровой и массивной), "братика" (злого, нервного и печального) и двух зевак (меня да друга заезжего) обошла гардероб в поисках уже не существующей дубленки, ситуация окончательно прояснилась. Была вызвана мама "братиков", а также найден другой "братик" и, к величайшему сожалению, потеряна и вторая дубленка.

Все смешалось в куртках, лицах и криках. Комендант заверила, что один из номерков поддельный. Бабушка поклялась, что именно поддельный номерок она изъяла у "братика". А выросший из-под земли завхоз в огромной шляпе сказал, что нечего ходить в дорогих куртках и выдвинул первую (и окончательную) версию: кто-то узнал (увидел? угадал?) номера дубленок, подделал (за 2 часа?!) два номерка, получил по ним дорогую добычу и "слинял", довольный и счастливый.

Пока выезжала милиция, была найдена гардеробщица, принимавшая куртки у ребят, которая вспомнила (?!), что примерно в 12.15 двое молодых людей подали ей два номерка и, ответив на вопрос "Что это номерки у вас такие?" дружным хором "Мы их отшлифовали", забрали дубленки и ушли. На этом воспоминания бедной бабушки обрываются.

Не знаю, что подумала о тревожном звонке милиция, но ровно через час, оцепив все входы и выходы, они ворвались к коменданту с криками: "Стоять! Руки за голову! Всем лишним выйти из комнаты!" Что происходило за дверью далее — мне не известно. Но через 2 часа ребятам, их маме и крестной популярно объяснили, что милиция ничего искать не будет. А если несчастная семья решит всё же взыскать убытки (немногим более 800 долларов), то судиться придется с университетом. Причем БГУ, может быть, и выплатит указанную сумму, но дальнейшая учеба "братиков" будет под большим вопросом. Разъяснив это и сфотографировав место бессовестной кражи, многоуважаемая милиция укатила с чистой совестью, большими чемоданами и заявлением горюющей матери, что дело заводить не надо.

***На этом, к сожалению, и прерывается невеселое повествование автора.***

***Рэдакцыя прапануе Вашай увазе вершы нашай сталай аўтаркі Алены СЯРКО, студэнткі філалагічнага факультэта.***

***

Дзверы. Зачынены.—
Адказ на пытанне.
Адказ: так ці не.
І — гэта ўсё ў вадзе.

***

Смерць можна любіць,
Смерць можна баяцца
Але пазбегнуць яе.
Не можа.
Ніхто.
Смерць прыходзіць да Вас
А Вы,
не ведалі часу.
А калі сам.
Захоча.
Сустрэцца.
З ёй?

***

Пакуты для крыві на іншай —
(не маёй) планеце;
І мне знайсці туды знічковы шлях
Даўжэй.
І ападзе дажджу сталёвая завеса —
Калі мне адысці за далягляд.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
Заснавальнік газеты - рэктарат БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

Мінская паліграфічная фабрыка "Чырвоная зорка" МВПА імя Я.Коласа. 220079, г. Мінск, 1-ы Загарадны зав., 3.

Газета падпісана ў друк у 12.00.

24 СНЕЖНЯ
Зак. 2016.
Т. 1000 экз.

220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 9, паверх 4, пакоі 411-412, тэлефон 2206827.

В.а. рэдактара Т.М. КАЗАК